# Злучальныя злучнікі,
# або Вяртанне ў мінулае сцежкамі дзядоў і прадзедаў

Урок беларускай мовы 7 клас

**А. С. Кель,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
СШ № 7 г. Ваўкавыска

**Мэта:**

мяркуецца, што да канца ўрока вучні будуць ведаць разрады злучальных злучнікаў па значэнні;

будуць умець

– правільна вызначаць разрады злучальных злучнікаў па значэнні;

– вылучаць злучальныя злучнікі ў сказах і ўстанаўліваць тыя значэнні, што яны перадаюць;

– складаць сказы з прапанаванымі злучнікавымі канструкцыямі;

– ужываць разнастайныя злучнікі ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

**Задачы:**

– спрыяць развіццю ўменняў працаваць з рознымі інфармацыйнымі крыніцамі; карыстацца асабістым вопытам падчас абмеркавання праблемнага пытання, выказваць і аргументаваць сваё меркаванне, рабіць высновы;

– удасканальваць камунікатыўныя уменні, неабходныя для работы ў пары, у школьным калектыве;

– сродкамі зместу ўрока, яго матэрыялам спрыяць пашырэнню і атрыманню новых ведаў пра каштоўнасці нацыянальнай культуры, выхаванню пачуцця любові да роднага краю.

**Месца ўрока ў тэме** “Злучнік”( 5 г.): 3-ці.

**Тып урока:** камбінаваны. **Тэхналогія** поўнага засваення ведаў.

**Метады навучання:** камунікатыўны, наглядны, практычны, элементы метаду актыўнай ацэнкі.

**Міжпрадметныя сувязі:** беларуская літаратура, гісторыя.

**Абсталяванне:** аформленая дошка, наглядны матэрыял, “маршрутныя” лісты з дыдактычным і ілюстрацыйным матэрыяламі, ноўтбукі, творчыя работы вучняў класа, вучэбны дапаможнік “Беларуская мова” (7 клас, 2015).

**Ход урока**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны.**

*Вучань* чытае на памяць уласны маналог.

Адчыняю сенцы: каля сцяны, пад акном, – услончык, а на ім – збаны і збаночкі, гаршкі і гарнушкі, гарлачыкі рознага колеру ды памеру. І ў кожнага ёсць сваё прызначэнне: у гарлачыках малако ці вяршкі, а ў гаршках тварог ці смятана.

За сенцамі – кухня. На стале стаіць ступка з таўкачыкам, каб пацерці каляндру для прыправ. На сцяне вісіць і рэшата, і бязмен – вельмі патрэбныя на вёсцы рэчы. І маслабойка ёсць, бо дзве каровы ў гаспадарцы, а масла любяць ўсе, хоць і не ўсе яго любяць збіваць!

Ёсць яшчэ майстэрня на дзве палавіны. З правага боку размешчаны варштат, а на ім – і свярдзёлак, і дрыль, і корба. Тут вострацьсярпы ды кляпаюць косы. З другога боку стаяць кросны. У бёрда запраўлены ніткі, ды чаўнок чакае працавітай рукі. І калаўрот ёсць, і матавіла, а на верацёнах пража з ільну ці шэрсці.

Ці то стукаюць кросны, ці то малаток па касе? Альбо ступка таўчэ, альбо маслабойка? Не, здалося, а можа, прыснілася?

Апусцела хата…

Вёска бацькоў маёй бабулі. Затое хата ажывае летам, калі прыязджаюць на канікулы ўнукі і праўнукі яе гаспадароў.

*Настаўнік:*

– Так няхай ажыве і наш школьны музей (Музей гісторыі Ваўкавышчыны). Сёння вы знойдзеце тут шмат цікавага і пазнавальнага. Запрашаю вас , мае вучні і паважаныя госці, вярнуцца ў мінулае сцежкамі дзядоў і прадзедаў.

**ІІ. Праверка дамашняга задання.**

*1.Запісаць тэкст, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары і знакі прыпынку.*

Як заўжды, у істо**п**цы **не** выводзіўся прыцемак**,** поўны звыклых пахаў. Праз мален**ь**кае, як бервяно, акенца сюды праб**і**валася слабае святло**,** і ў ім Пятрок **не**таропка агледзеў рад дашчаных засекаў пад глухой, без вокнаў, сцяной; пустыя цяпер, плеценыя з саломы, пузатыя карабы, у якія **не**калі ссыпалі збожжа, калі яно **не** мясцілася ў засеках. У куце туліліся жорны з тонкімі, сцёртымі ўжо камянямі**,** густа абсыпаныя шэрым мучным пылам. Тут пыліліся і Сцепанідзіны прасніца, калаўрот, святлеў асінавым бокам кубёлак з іржавымі абручамі, стаялі бол**ь**шай часткай пустыя ка**д**кі; пры сцяне **не**калькі год чакалі свае справы Сцепанідзіны кросны. Ля акенца віселі пляцёнкі леташняй цыбулі**,** **не**калькі бярозавых венікаў**,** пучкі лекавай травы. **Не**вялікая гэта істо**п**ка**,** запыленая і запавуціненая па кутках і пад столлю**,** была цесна забіта розным начыннем да самай каменкі-печкі. (Паводле В.Быкава)

*2.Арфаграфічная размінка.*

*Заданне:* выпісаць з тэксту словы, абавязкова выкарыстаць словы з адметнасцямі беларускай мовы. (Вучань выконвае заданне каля дошкі.)

*Магчымы варыянт:* прыцемкі, агледзець, дашчаны, калаўрот, запавуцінены, іржавы, вокны, мясціцца, абсыпаныя, жорны, шэры, ссыпаць, збожжа, начынне, плецены.

*3.Лексічная размінка.*

*Заданне:* растлумачыць прызначэнне прылад працы і прадметаў хатняга ўжытку, пра якія ідзе гаворка ў тэксце.

*Магчымы варыянт адказу:* жорны – пераціранне зерня на муку; прасніца – падвешванне кудзелі пры прадзенні; калаўрот – ручное прадзенне; кросны – ручное тканне; кубёлак – захаванне прадуктаў і рэчаў; кадка – заквашванне капусты і пад.

*Настаўнік:*

– З якой мэтай выкарыстоўвалася істопка персанажамі аповесці Васіля Быкава?

*Магчымыя адказы:* для захавання харчовых прыпасаў, для захавання гаспадарчых прылад.

**III.Тэмавызначэнне. Мэтавызначэнне.**

*Настаўнік:*

– Як вы лічыце,чаму я выбрала тэкст пра народнае жыллё?

*Магчымыя варыянты адказаў:*

– Менавіта народнае жыллё данесла да нас праз вякі і эпохі каштоўную інфармацыю аб тым, як жыў чалавек, чым жыў…

–Як арганізоўваў свой паўсядзённы быт, якімі прыладамі і рэчамі карыстаўся.

–Дазваляе прасачыць вытокі і эвалюцыю яго самабытнай культуры.

*Настаўнік* паведамляе тэму ўрока.

*Вучні* з дапамогай апорных слоў ведаць, умець ставяць задачы да ўрока.

*Настаўнік* арганізуе праблемную сітуацыю (фармулюе праблемнае пытанне):

–Чаму мы павінны наведваць музеі?

*Настаўнік.*

–Сцежкі – ніці паміж мінуўшчынай, сучаснасцю і будучыняй.

*Вучні* праглядаюць “маршрутны” ліст.

**IV.Тлумачэнне новага матэрыялу.**

*1.Бліц-апытванне:*

–Злучнік – службовая часціна мовы, якая… .

–Паводле саставу злучнікі падзяляюцца на … і … .

–Паводле спосабу ўжывання злучнікі падзяляюцца на …, … і … .

–Па значэнні падзяляюцца на … і … .

*2.Праца з тэкстам* (гл.уласны маналог вучня).

*Заданне:* вылучыць злучальныя злучнікі, даць характарыстыку некаторым з іх паводле саставу, спосабу ўжывання .

*3.”Самы назіральны і здагадлівы.”*

*Заданне:* вызначыць,што злучаюць злучальныя злучнікі?

*4.Самастойнае знаёмства з тэарэтычным матэрыялам* вучэбнага дапаможніка “Беларуская мова” (§41, с.194-195).

*5.Запаўненне табліцы “Разрады злучальных злучнікаў па значэнні”.* (Вучні працуюць у парах, адказваюць вусна.)

*Для даведкі настаўніку:*

Адзін *вучань* пералічвае ўсе спалучальныя злучнікі, а другі называе, што гэтыя злучнікі спалучаюць.

*6.Праца з рубрыкай “Паслухаем мовазнаўцу”.* (*Вучні* слухаюць маналагічны адказ вучня аб адрозненні супраціўнага злучніка **затое** ад спалучэння прыназоўніка **за** і займенніка **тое**, якія пішуцца ў сказе асобна – **за тое**.)

**V.Замацаванне вывучанага.** (Праца з ноўтбукамі.)

*1.Заданне:*

Суаднесці назвы ганчарных вырабаў і традыцыйных прылад са значэннем. У невялікіх тэкстах-апісаннях знайсці злучальныя злучнікі, вызначыць іх разрад па значэнні.

*Для дзяўчынак:*

А.Гарлач. Б.Гаршчок. В.Гляк.

1.Ганчарны выраб.

Гліняная пасудзіна для захоўвання і транспарціроўкі вадкіх рэчываў – алею, квасу, вады .

Шыракападобная, радзей крыху падоўжаная пасудзіна з плоскім дном, кароткім вузкім горлам, з дзюбкай або без яе, ручкамі.

2.Ганчарны выраб.

Гліняная пасудзіна для захавання малака і малочных прадуктаў.

Рабілі з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі і звужанай шыйкай, але шырэйшым за дно вусцем (без ручкі і дзюбкі). Прататып збана.

3.Ганчарны выраб.

Гліняная пасудзіна для гатавання гарачай стравы, захавання сыпкіх рэчываў.

Круглы з пукатымі бакамі, звужаным плоскім дном і вусцем, абкружаным венцамі (нярэдка з накрыўкай і ручкамі).Для большай трываласці часам апляталі дротам.

*Адказ:* А**2** Б**3** В**1**

*Для хлопчыкаў:*

А.Ступа. Б.Рэшата. В.Бязмен.

1.Традыцыйная прылада для апрацоўкі зерня на крупы.

Зерне ў ёй таўклі таўкачом – тоўстай выструганай палкай з паўкруглымі канцамі, а ў сярэдняй яго частцы рабілі выемку.

2.Драўляная ручная рычажная вага.

Металічны або драўляны стрыжань з пастаянным грузам (гірай) на адным канцы і кручком ці чашкай для ўтрымання грузу на другім. На стрыжні – шкала адліку і рухомая апора.

3.Прылада для прасейвання мукі ці правейвання зерня. Абечак рабілі звычайна з сухога лубу, дно – з рагожнай ці валасяной сеткі. У наш час абечак робяць з фанеры, а дно – з металічнай сеткі.

*Адказ:* А1 Б3 В2

*2.Заданне:* уставіць у загадкі злучальныя злучнікі па значэнні; над спалучальнымі злучнікамі надпісаць **сп**, над супраціўнымі – **с**, над размеркавальнымі – **р**.

*Варыянт 1*

1.Майстар, якога гліна баіцца, бо ён круціцца **і** верціцца. **(Ганчарны круг.)**

2.Сам худ, **а** галава з пуд. **(Бязмен.)**

3.Ёсць у мяне карова – у баку дзірка. Праз рот есць, праз рот **і** выкідвае. **(Маслабойка.)**

4.Маленькі Сідорка кусае **і** выкідае. **(Свярдзёлак.)**

*Варыянт 2*

1.Летам – па палях, ***а*** зімой – па шчылінах. **(Серп.)**

2.Конь гагоча **і** аўса хоча. **(Жорны.)**

3.Па тканым моры жалезны карабель плыве, мора пад ім шуміць **і** ўслед высыхае. **(Прас.)**

4.Новая кашуля, **а** ўся ў дзірачках. **(Рэшата.)**

*Для даведкі настаўніку:* заданне пададзена адразу з адказамі

*Настаўнік:*

– Што вы можаце расказаць пра словы-адгадкі? (Паказваюцца экспанаты школьнага музея .Экспазіцыя “Народны быт беларусаў”.)

*Індывідуальнае заданне:* скласці лінгвістычныя загадкі ( слова – прылада працы або прадмет хатняга ўжытку), пракаменціраваць, выкарыстоўваючы сказы са злучальнымі злучнікамі. ( Два *вучні* працуюць каля дошкі.)

*Магчымыя варыянты лінгвістычных загадак :*

Гарлачык. ( Корань, як у слове **гарл**авіна. Першы суфікс, як у слове чыт**ач**, а другі суфікс, як у слове хлопч**ык**. Канчатак , як у слове цясляр□ або гусляр□.)

Прасніца.(Корань, як у слове **прас**. Суфікс, як у слове работ**ніц**а або правад**ніц**а. Канчатак, як у слове бондарств[а] ці ганчарств[а].)

*3.Настаўнік:*

–Назавіце школьныя музеі горада і раёна, якія вы наведалі ў рамках раённага праекта “Музейная карта”.

*Магчымыя адказы вучняў:*

– Музей жанчыны-маці ў ДУА “Гімназія № 2 г. Ваўкавыска”; экспазіцыі “Маці-працаўніца” і “Маці-майстрыха”.

–Гісторыка-краязнаўчы музей у ДУА “Падароскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад –сярэдняя школа; экспазіцыі “Традыцыйны лад жыцця нашых землякоў: сялянскі двор і інтэр’ер хаты”.

–Школьны музей у ДУА “ Шылавіцкая сярэдняя школа”; экспазіцыя “Беларуская хатка”.

–Музей савецкай эпохі ў ДУА “Сярэдняя школа № 5 г. Ваўкавыска; экспазіцыя “Інтэр’ер савецкай кватэры”.

*Настаўнік:*

– Разгадваючы крыжаванку, вы зразумееце, што словы-адгадкі – прадметы, якія ёсць у нашым школьным музеі , а некаторыя з іх – у школьных музеях горада і раёна, якія мы ўжо наведалі.

*Крыжаванка “Подых мінулага”.*



1.Ён можа быць літаратурны, краязнаўчы, гісторыі Ваўкавышчыны і інш.

2.Прадметы культуры мінулага.

3.Агульны жыццёвы ўклад, паўсядзённае жыццё.

4.Свідравальны інструмент для пракручвання адтулін.

5.Металічныя шчыпцы(кавальскія клешчы).

6.Карытападобная пасудзіна з шырокім адкрытым верхам.

7.Гліняная пасудзіна, абгорнутая бяростай.

8.Плоскі брусок з ручкай для выбівання бялізны пры мыцці ці абіванні, абмалоту лёну.

9.Драўляная або жалезная качалка для разгладжвання скуры ў гарбарным рамястве.

10.Яго важныя часткі: ставы, навоі і ніты, бёрда з набіліцамі, панажы і кацёлкі.

*(У час праверкі словы-адгадкі запісваюцца вучнямі па чарзе на дошцы, каб пазбегнуць арфаграфічных памылак.)*

*Даведка для настаўніка: адказы занесены ў крыжаванку.*

*4.Літаратурны рынг.*

*Заданне:*прыгадаць мастацкія творы, у якіх узгадваюцца прылады працы, прадметы хатняга ўжытку. Абавязкова назваць жанр твора.

*Магчымыя варыянты адказу:*

–Беларуская народная казка “Залатая яблынька” (верацяно).

–Беларуская народная казка “Жаронцы” (жорны).

–Руская народная казка “Муж-гаспадыня”(маслабойка).

–Руская народная казка “Ліса і збан”(збан).

–Верш П.Броўкі “Вясновая кніга” (гляк).

–Верш У.Арлова “Жорны” (жорны).

–Паэма Я.Коласа “Новая зямля” (свярдзёлак, гарнушак).

–Нарыс У Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі” (гаршкі, збаны, маслабойка, кросны).

**VI.Фізкультхвілінка.** Гімнастычны комплекс “Сапраўдны беларус”. (Праводзяць хлопчык і дзяўчынка – беларус і беларусачка.)

–Сапраўдны беларус – гэта чалавек, які

*–заўсёды гатоў стаць побач з таварышам;*

*–працягнуць руку дапамогі іншаму чалавеку;*

*–прыняць дапамогу сябра;*

*–лёгка схіліцца да старога і малога;*

*–дацягнуцца да мары;*

*–прысесці, каб палюбавацца прыгажосцю кветкі;*

*–падняцца пасля няўдачы;*

*–глыбока ўздыхнуць па тым, што не ўдалося;*

*–прадоўжыць работу, каб дабіцца поспеху.*

*Даведка для настаўніка:* у аснову стварэння гімнастычнага комплекса пакладзена творчая работа вучня (інсцэніроўка).

*Апераджальнае заданне:* трэба было прачытаць раздзел “Людзі зямлі беларускай” з нарыса Уладзіміра Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі” і вызначыць асноўныя рысы характару беларусаў, падрыхтаваць цытаты.

(“Галоўнай рысай беларусаў з’яўляецца свабодалюбства”.

“Вызначаецца народ утрапёнай любоўю да працы”.

“Беларус адрозніваецца заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу”.

“Выдзяляецца беларус і сваёй цярплівасцю”.

“Адной з галоўных рыс у характары беларуса з’яўляецца гасціннасць да добрых людзей”.

“Самасуцяшэнне ў спалучэнні з гумарам і стойкасцю, здольнасць знайсці выйсце, хаця б маральнае, з самага безнадзейнага становішча вызначаюць характар беларуса”.

“Рэаліст у рэальным жыцці, беларус вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах”.

*Вывад:* самае важнае – быць добрым і чулым чалавекам, валодаць унутраным патэнцыялам.)

**VII. Абагульненне вывучанага. Падвядзенне вынікаў.**

*1.Літаратурная хвілінка. Вучаніца* чытае на памяць уласны верш.

У калаўроце кужаль плача,
Паміж бёрдаў чаўнок скача.
Будзе ходнік, абрусок
Ды прыгожы паясок!

А на прыпечку гарачым
З кіслым малаком гарлачык.
Як адкінеш у ражок -
Будзе смачны тваражок.

Накляпалі хлопцы косы
Ды пайшлі касіць у росы.
Луг ля рэчкі, беражок,
А праз тыдзень ужо стажок!

Як у казцы, не іначай,
Той стажок і той гарлачык!
Даўніны роднай рубяжы
Ты ў штодзённым зберажы!

*2.Лексічная хвілінка* “Узбагачаем мову народным словам”.

*Заданне:* назваць словы ,ужытыя ў вершы, якія абазначаюць прылады і рэчы хатняга ўжытку.

(Калаўрот, бёрда, чаўнок, гарлачык, ражок, каса.)

*3.Графічны дыктант.*

*Заданне:* вылучыць злучальныя злучнікі ў сказах і ўстанавіць тыя адносіны, што яны перадаюць.

*4.Зварот да праблемнага пытання.*

*Вучні* адказваюць на праблемнае пытанне, карыстаючыся словазлучэннямі, якія былі прапанаваны ім у дапамогу:

аб’ектыўнае ўяўленне, асаблівасці культуры, матэрыяльная культура, зберагаць душу, неацэнны скарб, сакрэты майстроў, наш народ.

*Магчымыя варыянты адказаў:*

–Музеі даюць магчымасць атрымаць дастаткова аб’ектыўнае ўяўленне аб асаблівасцях матэрыяльнай культуры.

–Музеі дапамагаюць зразумець нам сакрэты майстроў таго часу.

–Ведаць і зберагаць народную культуру – гэта значыць зберагаць душу народа.

–Музеі – неацэнны скарб нашага народа.

–Музеі – мудрасць і вопыт нашых дзядоў і прадзедаў.

**VIII. Рэфлексія.**

*Настаўнік:*

–Даць рэкламу музеям, каб па структуры нагадвала сінквейн. (*Вучні* працуюць у парах.)

*Дэманструецца алгарытм складання сінквейна.*

*Сінквейн*

1.Тэма гаворкі ( 1 назоўнік).

2.Апісанне тэмы (2 прыметнікі).

3. Дзеянні, што адносяцца да тэмы сінквейна (3 дзеясловы).

4.Фраза, сказ з чатырох слоў, з дапамогай якіх выказваюцца адносіны да тэмы.

5.Слова-рэзюмэ (асацыяцыя), якое паўтарае сутнасць тэмы.

*Абавязковая ўмова пры складанні сінквейна:* выкарыстаць, дзе магчыма, злучальныя злучнікі.(Праілюстраваць эмацыянальную нагрузку злучніка.)

*Магчымыя варыянты сінквейна:*

Музей
Школьны. Этнаграфічны.
Збірае, вывучае і зберагае.
Выстаўляе помнікі матэрыяльнай культуры.
Спадчына.(Скарб.)

Музей
Цікавы і пазнавальны.
І здзіўляе, і дапамагае, і натхняе.
Спрыяе духоўнаму развіццю асобы.
Мудрасць.(Вопыт.)

*Настаўнік:*

– Гісторыя культуры не заканчваецца сучасным момантам, яна мае свой працяг, які прадвызначаны генетычнай сувяззю пакаленняў. У выніку мінулае становіцца неад'емнай часткай сучаснасці, а повязь эпох і пакаленняў не перарываецца.

–Культура – гэта сукупнасць дасягненняў чалавецтва ў вытворчасці, грамадскім і разумовым жыцці. "Без культуры існаванне чалавецтва губляе сэнс". (Д.С.Ліхачоў.)

*Вучні* прыгадваюць, што 2016 – Год культуры. Слухаюць інфармацыйныя хвілінкі ("Музей праса" і "Музей народнай творчасці"Бездзежскі фартушок" ), падрыхтаваныя ўдзельнікамі праекта дзіцячай ініцыятывы "Наша краіна Піянерыя".

Вучні ацэньваюць сваю працу на ўроку :

–На ўроку я атрымаў адказы на пытанні…

–Я ўмею…

–Хацелася б…

*Госці* атрымліваюць сувеніры, зробленыя рукамі вучняў і іх бацькоў.(Сувенірная крама.)

**IX.Дамашняе заданне. Каментарый.**

1.§ 41, пр.296 (с.199 вучэбнага дапаможніка).

2.Напісаць нататку ў газету пра незвычайны ўрок беларускай мовы.
*Вучні* слухаюць каментарый настаўніка, робяць запісы ў дзённіках.

## Літаратура


1. **Зелянко, В. У.** Вывучэнне марфемнай будовы слова і словаўтварэння ў лінгвакультуралагічным аспекце: раздзел “Слова ў тэксце”, X клас / В.У. Зелянко // Роднае слова. – 2010. – №2.
2. **Зелянко, В. У.** Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10-11 класы: вучэбна-метадычны дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / В. У. Зелянко. – Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.
3. **Лакотка, А. І.** Пад стрэхамі прашчураў / А.І. Лакотка. – Мінск, 1995.
4. Міхневіч, А.Я. Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А.Я. Міхневіч, Л.П. Кунцэвіч, Ю.В. Назаранка. – Мінск: Выд.цэнтр. БДУ, 2006.
5. **Цітоў, В. С.** Этнаграфічная спадчына. Беларусь. Традыцыйна-бытавая культура / В.С. Цітоў. – 2-е выданне. – Мінск: Беларусь, 2001.
6. **Этнаграфія Беларусі:** энцыклапедыя. – Мінск, 1989.